УДК 81’374

**К. В. Багдановіч**
**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт”, кафедра рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій**

# АСАБОВЫЯ НАЗОЎНІКІ Ў ДВУХМОЎНЫМ ЛЕКСІКАГРАФІЧНЫМ ДАВЕДНІКУ ЯНКІ СТАНКЕВІЧА

У артыкуле разглядаюцца назоўнікі, што называюць асобу, змешчаныя на літару «А» ў беларуска-рускім слоўніку Янкі Станкевіча, іх тэматычныя групы, адпаведнікі паводле граматычнага роду.

The article deals with nouns denoting a person in the Belarusian-Russian Dictionary Yanka Stankevich, their thematic groups, the grammatical gender.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Ключавыя словы*: асоба, назоўнік, слоўнік, беларуская мова, руская мова, Янка Станкевіч.
*Key words:* person, nouns, dictionary, Belarusian, Russian, Yanka Stankevich.

“Вялікалітоўска-расійскі слоўнік” Я. Станкевіча (больш за 60 000 артыкулаў), быў апрацаваны і выдадзены пасля смерці аўтара яго сынам Ю. Станкевічам у Нью-Ёрку ў 1990 г. [1]. Выданне спалучае ў сабе рысы перакладнога і тлумачальнага слоўнікаў, прынцып пабудовы якога – гнездавы. Асноўная мэта лексікаграфічнай працы – пазнаёміць шырокія колы беларусаў з багаццем беларускай нацыянальнай мовы. Даследчык творчасці Я. Станкевіча Ю. Бушлякоў адзначаў: «Станкевічавы пошукі ў галіне лексікалогіі вызначаліся паслядоўным радыкальна-пурыстычным падыходам. Пашыраючы лексемы з старабеларускіх крыніц, з роднага дыялекту, з этнаграфічных матэрыялаў XIX і XX стст., з слоўнікавых збораў І. Насовіча, Ул. Даля, Ул. Дабравольскага, М. Гарэцкага, В. Ластоўскага і многіх іншых лексікографаў, вучоны кіраваўся прынцыпам міжмоўнай дыферэнцыяцыі. Значныя вынікі прынесла і індывідуальная словатворчасць: Я. Станкевіч, скарыстоўваючы дэрывацыйны патэнцыял беларускай мовы, стварыў не адзін дзясятак новых слоў. Відавочна, што, з практычных меркаванняў, лексікограф падаваў перакладаныя беларускія словы і ілюстрацыйны матэрыял у адпаведнасці з літаратурнымі правапіснымі нормамі. Аўтар не ставіў сабе задачы стварыць нарматыўны слоўнік: яго мэтаю стала творчае апрацаванне лексічнага патэнцыялу беларускай мовы» [2].

У беларускай лінгвістыцы маецца нямала прац, прысвечаных асабовым намінацыям. У большасці з іх лексемы, якія называюць асоб, разглядаюцца з пункту погляду іх утварэння: С. Клундук [4], Д. Кананенка [5], М. Паўленка [6], Л. Куршакова [7], Н. Архіпава [8, 9], В. Грыб [10] і іншыя. Адну з першых спроб скласці слоўнічак асабовых жаночых намінацый здзейсніў у 2016 г. У Арбацкі [11].

Як сцвярджаюць мовазнаўцы, асабовыя назоўнікі займаюць адно з цэнтральных месцаў у лексічнай сістэме мовы. Яны не толькі называюць асобу па нейкай прыкмеце, але і адлюстроўваюць розныя накірункі паводзін і быцця чалавека, дакладна і глыбока раскрываюць нацыянальныя, сацыяльна-палітычныя і бытавыя паняцці і ўяўленні народа [3]. Правядзенне такога даследавання дазволіць наблізіцца да стварэння канцэпцыі інавацыйнай для беларускага кнігавыдання лексікаграфічнай працы і паслужыць крыніцай фактычнага матэрыялу для электроннага слоўніка лінгвакультуралагічнага тыпу з рабочай назвай «Як беларусы называюць асоб».

Задача даследавання – метадам суцэльнай выбаркі выявіць усе асабовыя назоўнікі, змешчаныя ў слоўніку Я. Станкевіча на літару «А», і ўстанавіць іх тэматычныя групы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Усяго на літару «А» ў слоўніку было выяўлена 176 назоўнікаў, якія абазначаюць асобу. З іх 106 назоўнікаў мужчынскага роду (м. р.), 44 жаночага роду (ж. р.) і 26 – агульнага роду (агул. р.).

1. **Назвы асоб па месцы жыхарства** (5 **адзінак**). Сярод іх: *аднаселянін* **—** **'**одной деревни житель, односельчанин**'**; *амарыка́нец* — **'**американец: так называют и великолитвина (белоруса), побывавшего в Америке**'**; *апліка́нец* — **'**африканец**'**; *асе́лец* — **'**оседлый; местный житель**'**; *аўстрыя́ка (аўстра́ка)* — **'**австриец**'**. Назоўнік ж. р. ёсць толькі да *апліка́нец — апліка́нка***.**

2. **Назвы асоб па прыкметах знешнасці** (6 адзінак). Гэта 1 назоўнік агул. р. *апу́цак* — **'**полный лицом мальчик или девочка, толстячок' і 5 назоўнікаў м. р., да якіх няма ж. р.: *аха́ха* — 'верзила; здоровый, рослый человек, «косая сажень на плечах»'; *апоўзьлік* — 'неповоротливый, слабый человек, слабосильный, хилый'; *апе́куш* — **'**жирный, толстый**'**; *апра́т* — **'**здоровенный, большой**'**; *асі́лак* — **'**богатырь, силач, обладающий необыкновенной силой, исполин**'.**

3. **Назвы асоб па полу і ўзросту**, назва самой асобы (2 адзінкі): *аднагодак* — **'**однолеток, ровесник, одногодок**'**; *асьмачок* — **'**осмилетний мальчик'. Назоўнік ж. р. ёсць да *аднагодак — аднагодка***.**

4. **Назвы асоб па роднасці і сваяцтве** (4 словы). Да іх адносяцца *адзіна́к* — **'**один сын в семье**'**; *айцёц* — 'отец'; *айчы́м* — **'**отчим**'**; *ацец* — **'**отец**'**. Назоўнік агул. р. ёсць да слова *адзіна́к — адзіна́ка***.**

5. **Назвы асоб па сацыяльным статусе і грамадскіх адносінах** (12 адзінак). Гэта 1 назоўнік агул. р.; *аспода* — **'***гаспода***'. Астатнія** м. р.: *аліндáр* — **'**арендатор**'**; *апякáльнік* — **'**покровитель, протектор**'**; *апрычнічак* — **'**любимчик, баловень**'**; *абароньнік* — **'**защитник**'**; *абракáньнік* — **'**жертвователь**'**; *абрáнец* — **'**избранник, любимец**'**; *адзоўнік* — **'**апеллятор**'**; *адработнік* — **'**тот, кто работает за долг**'**; *аляндáр* — **'**арендатор, откупщик**'**; *апякýн* — **'**опекун; заботящийся, проявляющий заботу о ком, чём-либо**'**; *асподнік* — **'***гасподнік'*. Да 8 з іх падаюцца назоўнікі ж. р.: *абароньнік — абароньніца***,** *абракáньнік — абракáньніца***,** *абрáнец — абранка***,** *адзоўнік — адзоўніца***,** *адработнік — адработніца***,** *аляндáр — аляндáрка***,** *апякýн — апякýнка***,** *асподнік — асподніца***.**

6. **Назвы асоб па рысах характару, паводзінах** (49 адзінак). Сярод іх 18 назоўнікаў агул. р.: *абáкула* — 'обманщик, -ица, преимущественно такие, которые в глаза обманывают, плут'; *аббрахала* — **'**клеветник, поноситель**'**; *абібока* — 'лентяй'; *абры́да* — **'**мерзавец, -вка, гадкое дитя**'**; *абібочына* — 'лентяй, -ка'; *абшчыпак* — **'**шельма**'**; *агíда* — **'**отвратительный, -ная**'**; *агурэнь* — **'**апатичный, ленивый, грубиян, упрямец**'**; *абуза* — **'**человек плохого или дурного поведения**'**; *агры́за* — **'**сварливый, -вая, дурного



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нрава’; *агрызак* — ‘сварливый, -вая, дурного нрава, тот, та, который, -ая огрызается, грубо отвечает’; *айкала* — ‘стонущий без умолку, кричавший при всяком прикосновении, недотрога’; *агýра* — ‘лодырь’; *акáіна* — ‘бессовестный, нераскаянный, -ая’; *аплывýда* — ‘медлительный, неповоротливый и в то же время некрасивый’; *апрыcак* — ‘вспыльчивый, -вая’; *аторва* — ‘*сорванец, говорится в похвалу молодечества; удалой-лая, проказник, -ица*’; *ачамéра* — ‘надоеда’. 3 назоўніка ж. р., да якіх няма м. р.: *агніньніца* — ‘бойкая, шустрая на что-либо’; *анýча* — ‘женщина дурного поведения или неопрятная’; *ашукáлка* — ‘обманщица’. 27 назоўнікаў м. р.: *абакýльнік* — ‘обманщик’; *абязурнік* — ‘шалун, озорник’; *абдзірала* — ‘берущий или требующий непомерной цены, платы’; *абібок* — ‘лежебок, лентяй, лодырь’; *абмоўца* — ‘клеветник’; *абротнік* — ‘бездельник’; *абрыдак* — ‘мерзавец’; *абрыднік* — ‘мерзавец’; *абузьнік* — ‘шалун’; *агíднік* — ‘гадкий, сквернасловец’; *агрызьнік* — ‘сварливый’; *агýканьнік* — ‘клеветник, поноситель’; *адраджэнец* — ‘возрождённый мужчина’; *адвáжнік* — ‘смельчак’; *акушэнец* — ‘обманщик’; *андзія* — ‘пустомеля’; *апяшэлы* — ‘сконфуженный, озадаченный’; *апрамéтніца* — ‘резвая, ветренная’; *апрашчонік* — ‘человек опростившийся’; *апрыкронік* — ‘надоедливый’; *апрычонік* —‘любящий особенно от семьи лучшие кушанья, требующий особенного чего от общего стола’; *апушчэнец* — ‘неряха, небрежный, лентяй’; *апушчэнік* — ‘неряха, небрежный; распутный, развратный, ленивый’; *асýднік* — ‘любящий осуждать других’ *ашавýрак* — ‘замухрышка’; *ашукáльнік* — ‘обманщик’; *ашчэрак* — ‘зубоскал’; *атрýтнік* — ‘отправитель, побранка на лентяя, на сварливого и вообще на надоедливого’; *авантýрнік* —‘авантюрист’; да 10 з іх ёсць назоўнікі ж. р.: *абрыднік — абрыдніца, абузьнік — абузьніца, агíднік — агíдніца, агрызьнік — агрызьніца, агýканьнік — агýканьніца, адраджэнец — адраджэнка, апяшэлы — апяшэлая, апрычонік — апрычоніца, апушчэнец — апушчэнка, апушчэнік — апушчэніца, ашукáльнік — ашукáльніца.*

7. **Назвы асоб па адносінах да ежы** (6 адзінак). Сярод іх 4 назоўніка агул. р.: *аб’ядайла* — ‘обжора’; *апоіна* — ‘с жадностью пьющий -щая; пьяница, много употребляющий хмельного’; *апока* — ‘прожора, объедало; жестокий пьяница; лентяй, лежебок’; *апрýда* — ‘ленивый обжора’. 2 назоўніка м. р.: *апівáка* — ‘любящий «*апіваць»*’; *апрычнік* — ‘любящий отдельно от других кушать, прихотливый’; назоўнік ж. р. падаецца толькі да 1 з іх: *апрычнік — апрычніца.*

8. **Назвы асоб па прафесійнай дзейнасці** (30 адзінак). Сярод іх 1 назоўнік ж. р., да якога не падаецца м. р.: *асыпáльня* — ‘женщина, обсыпающая вручную землёй при помощи *“гачкі”* молодые корнеплоды (картофель и проч.)’. Астатнія — назоўнікі м. р.: *аборнік* — ‘заведующий



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

скотным двором, подстилкой хлевов и прокормом скота зимней порой'; *абара́ньнік* — 'промышляющий печением или продажей сушек, баранок'; *абіраньнік* — 'выборщик'; *абразьнік* — 'торговец образами, иконами; торговец картинами'; *адводнік* — 'проводник плотов в опасных местах'; *адвака́т* — 'адвокат'; *актор* — 'актёр'; *акцы́зьнік* — 'акцизный чиновник'; *алавя́ньнік* — 'свинцовых дел мастер'; *алхірэй* — 'архирей'; *але́йнік* — 'изготовляющий или продающий растительное масло'; *анатом* — 'анатом'; *антыле́рнік* — 'артиллерист'; *ану́чнік* — 'скупщик тряпья'; *апліка́нт* — 'ученик-практикант'; *апра́ўнік* — 'переплётчик'; *аптака́р* — 'аптекарь; работник аптеки, изготовляющий лекарства, фармацевт; владелец аптеки'; *аральбі́т* — 'пахарь'; *ара́ты* — 'пахарь'; *арганíсты* — 'клирик в римско-католической церкви, играющий на органах при богослужении'; *арга́ньнік* — 'мастер, делающий органы; настройщик органа'; *архідзя́кан* — 'архидиакон'; *архірэй* — 'архиерей'; *арла́н* — 'пахарь'; *арты́сты* — 'артист'; *асна́ч* — 'работник на водоходных суднах, барочник, судовщик, бурлак, речной матрос'; *асьпя́нік* — 'оспопрививатель'; *аўся́нік* — 'торговец овсом; шишечник'; *аўчы́ньнік* — 'человек, вырабатывающий овчины; дубильщик, скорня'. Назоўнікі ж. р. ёсць да 9 адзінак м. р.: *абіраньнік — абіраньніца, адвака́т — адвака́тка, актор — акторка, але́йнік — але́йніца, анатом — анатомка, апра́ўнік — апра́ўніца, аптака́р — аптакары́ха і аптакары́ца, арты́сты — арты́стая.*

9. **Назвы асоб па маёмаснаму стану, ладу жыцця** (5 адзінак). Гэта 1 назоўнік ж. р., да якога не падаецца м. р.: *ашара́* — 'проходимка'. Астатнія — назоўнікі м. р.: *абадра́нец* — 'оборванец'; *абшарпанец* — 'оборванец'; *абшарпанік* — 'оборванец' *ашмётак* — 'дрянь, лохмотник' — да 3 з іх ёсць назоўнікі ж. р.: *абшарпанік — абшарпанка, ашмётак — ашмётачка.*

10. **Назвы асоб па разумовых здольнасцях, навыках** (6 адзінак). Гэта 1 назоўнік агул. р.: *азу́ка* — 'проворный и умный мальчик или девочка, проворный, -ая, бойкий, -ая, шустрый, -ая'; і назоўнікі м. р.: *абізгал* — 'дурак'; *аднаду́м* — 'единомышленник'; *адумысловец* — 'специалист'; *акы́ш* — 'простофиля'; *ама́тар* — 'любитель'. Назоўнік ж. р. ёсць толькі да *адумысловец — адумыслоўка.*

11. **Назвы рэлігійных, міфалагічных, фантастычных істот, падобных на чалавека** (5 адзінак). Гэта назоўнікі м. р., да якіх няма ж. р.: *адкотны яблычак* — 'обращение к покойнику'; *а́нгіл, а́нгіль, а́нгыл* — 'ангел'; *анты́хрыст* — 'антихрист, бранное'; *анцы́хрыст* — 'антихрист; слово бранное: немилосердный'; *апе́кан* — 'чёрт, дьявол, житель ада'.

12. **Назвы асоб па жыццёвым поглядах** (6 адзінак). Сярод іх: *адрочнік* — 'отрёкшийся от Бога'; *адшчапе́нец* — 'отступник от веры,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

раскольник’; *анархі́сты* — ‘анархист’; *астáлец* — ‘реакционер’; *асьвéтнік* — ‘просветитель’; *аўтары́сты* — ‘служитель культа’. Назоўнік ж. р. ёсць для *адшчапéнец — адшчапéнка, анархі́сты — анархістая.*

13. **Лаянкавыя назвы асоб** (3 адзінкі). Гэта 1 назоўнік агул. р.: *асьлю́га* — ‘бранное’; і два м. р., да якіх няма ж. р.: *анты́хрыст* — ‘антихрист; бранное’; *анцы́хрыст* — ‘антихрист; слово бранное: немилосердный’.

Такім чынам, сярод выяўленых асабовых назоўнікаў з лексікаграфічнага даведніка Я. Станкевіча было вызначана трынаццаць тэматычных груп. Самая шматлікая з іх — група найменняў асоб па рысах характару і паводзінах (усяго 49 адзінак). Нельга лічыць гэта незвычайным, бо найбольш часта пры называнні таго ці іншага чалавека мы выкарыстоўваем звесткі пра яго характар, паводзіны. У слоўніку Я. Станкевіча змешчана значна больш асабовых назоўнікаў мужчынскага роду, чым жаночага. Гэта звязана з тым, што назоўнікамі мужчынскага роду абазначаюць таксама жанчын, калі гавораць аб прафесійнай дзейнасці чалавека. А ў іншых выпадках назоўнікі мужчынскага роду не маюць адпаведнікаў жаночага роду (відаць, па тэхнічных прычынах пры падрыхтоўцы выдання).

## Літаратура

1. Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 1994. — 655 с.

2. Станкевіч, Я. Збор твораў : у 2 т. / рэдкал.: В. Булгакаў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Энцыклапедыкс, 2002. — Т 2. — 586 с.

3. Белоусова, А. С. Русские имена существительные со значением лица: лексический класс и вопросы его словарного описания / А. С. Белоусова // Вопросы языкознания. — 1981. — № 3. — С. 71–84.

4. Клундук, С. С. Словаўтваральная сістэма назоўнікаў са значэннем асобы ў беларускай мове XIX ст. : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / С. С. Клундук ; ІМ НАН Беларусі. — Мінск, 2001. — 20 с.

5. Кананенка, Д. А. Асабовыя назоўнікі нямецкага паходжання ў мове беларускай мастацкай прозы / Д. А. Кананенка // Веснік Віцебскага дзярж. ун-та. — 2007. — № 4 (46). — С. 111–117.

6. Паўленка, М. А. Нарысы па беларускаму словаўтварэнню. Жаночыя асабовыя намінацыі ў старабеларускай мове / М. А. Паўленка. — Мінск : Выд-ва БДУ, 1978. — 136 с.

7. Куршакова, Л. А. Разрады асабовых назоўнікаў з суфіксамі *-ок-* (*-ак-*) у беларускіх гаворках / Л. А. Куршакова / Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час : зб. навук. арт. / рэдкал.: А. А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. — Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. — С. 95-97.

8. Архіпава, Н. К. Асабовыя адсубстантываваныя назвы са значэннем «жыхар» у сучаснай беларускай мове / Беларуская лінгвістыка. — Мінск : Беларуская навука, 2011. — С. 146–155.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

9. Архіпава, Н. Найменні асобы ў сучаснай беларускай мове (стан даследавання) / Н. Архіпава / Мова — літаратура — культура : матэрыялы V Міжнар. навук. канф. (да 80-годдзя праф. Л. М. Шакуна), Мінск, 16–17 лістапада 2006 г. / Беларускі дзярж. ун-т. — Мінск : Права і эканоміка, 2007. — С. 366–369.

10. Грыб, В. Назоўнікі са значэннем асобы па нацыянальнай і этнічнай прыналежнасці ў сучаснай беларускай мове / В. Грыб / Мова — літаратура — культура : матэрыялы V Міжнар. навук. канф. (да 80-годдзя праф. Л. М. Шакуна), Мінск, 16–17 лістапада 2006 г. / Беларускі дзярж. ун-т. — Мінск : Права і эканоміка, 2007. — С. 373–376.

11. Гарбацкі, У. Гід па фэмінізацыі беларускай мовы (Nomina agentis і некаторых іншых асабовых намінацый) / У. Гарбацкі. — Вільня : Выдавец І. Іваноў, 2016. — 144 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова